**Ministry of Culture of the Republic of Belarus**
**Department of Culture of Vitebsk Regional Executive Committee**
**Polotsk National Historical and Cultural Museum-Reserve**

# History and Archaeology of Polotsk and Polotsk land

Scientific articles and materials
of the 5th International Conference

Polotsk 2009

**Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**
**Упраўленне культуры Віцебскага аблвыканкама**
**Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік**

# Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі

Матэрыялы V Міжнароднай навуковай канферэнцыі

(24–25 кастрычніка 2007 г.)

Полацк 2009

63.3 (4Беі)
Г51

**Укладальнік**
Т.А. Джумантаева, нам. дырэктара па навуковай рабоце Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка

**Рэцэнзенты**
С.В. Тарасаў, канд. гіст. навук
А.А. Трусаў, канд. гіст. навук

Г51 **Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі:** матэрыялы V Міжнароднай навуковай канферэнцыі (24–25 кастрычніка 2007 г.). — Полацк: НПГКМЗ, 2009. — 394 с.: іл.

У зборніку апублікаваны даклады V Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі», якая праходзіла 24–25 кастрычніка 2007 г. на базе Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

У дакладах удзельнікаў знайшлі адлюстраванне разнастайныя праблемы гісторыі, археалогіі і інфарматыкі Полацкай зямлі і сумежных тэрыторый ад старажытнасці да нашых дзён.

**ББК 63.3 (4Беі) + 79.1 (4Беі)**

Асаблівасці мовы і арфаграфіі аўтараў захаваны

© Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, 2009
©Калектыў аўтараў, 2007

# Антрапалогія двух грунтовых могільнікаў курганнага перыяду
### (да пытання аб этнічнай сітуацыі на тэрыторыі Полацкай зямлі ў X–XIII стст.)

***Емяльянчык В.А.***

Да нядаўняга часу асноўнай крыніцай інфармацыі аб антрапалагічным складзе насельніцтва Полацкай зямлі X–XIII стст. служылі курганныя пахаванні. Аднак у 90-я гады мінулага стагоддзя беларускімі археолагамі была выяўлена і даследавана новая катэгорыя пахавальных помнікаў, а менавіта – грунтовыя могільнікі, сінхронныя курганным. Да іх адносяцца могільнік XI–XIII стст. Дрысвяты-Пашавічы (Браслаўскі раён, раскопкі Г. Семянчука) і грунтовы могільнік X–XI стст. Казлоўцы (Міёрскі раён, раскопкі Л. Дучыц і Г. Семянчука).

***Грунтовы могільнік Дрысвяты-Пашавічы (XI–XIII стст.)*** уваходзіць у склад археалагічнага комплексу, які ўключае таксама гарадзішча і селішча, размешчаныя на востраве «Замак» возера Дрысвяты. Археолагі трактуюць гэты комплекс як памежную крэпасць Полацкай зямлі XI–XIII стст. [7]. Грунтовы могільнік размешчаны на бліжэйшым ад вострава паўвостраве, за 1,5 км на паўднёвы захад ад вёскі Пашавічы. Стан захаванасці краніялагічнага матэрыялу дазволіў нам даследаваць 9 мужчынскіх і 7 жаночых чарапоў.

Сумарная мужчынская серыя грунтовага могільніка Дрысвяты-Пашавічы характарызуецца даліхакраніяй, вялікімі памерамі падоўжанага і высотнага дыяметраў чэрапа, сярэднімі – папярочнага. Твар сярэдні, як па абсалютных памерах, так і па верхнетвараваму паказальніку, артагнатны, рэзка прафіляваны як на ўзроўні арбіт, так і на ўзроўні скул. Арбіты шырокія і нізкія, нос сярэднешырокі, моцна выступаючы, з высокім пераноссем, на што ўказваюць высокія значэнні дакрыяльнага і сіматычнага паказальнікаў [4, с. 17–18].

Сумарная жаночая серыя характарызуецца тымі ж суадносінамі памераў мазгавога аддзелу чэрапа, што і мужчынская. Звяртае на сябе ўвагу перавага вельмі вялікіх памераў падоўжанага дыяметра чэрапа. Твар шырокі і высокі па абсалютных памерах, па верхнетвараваму пазальніку – сярэдні. Арбіты шырокія і сярэдневысокія, нос сярэднешырокі і сярэдневысокі, па насавому паказальніку – шырокі. Як і мужчынскія, жаночыя чарапы характарызуюцца моцнай прафіліроўкай твару на ўзроўні арбіт і скул, а таксама моцным выступаннем пераносся [4, с. 17–18].

У параўнанні з сумарнай серыяй курганных чарапоў з тэрыторыі Полацкай зямлі серыя мужчынскіх чарапоў з грунтовага могільніка Дрысвяты-Пашавічы вылучаецца некаторым павелічэннем высотнага дыяметра

чэрапа, верхняй вышыні твару, а таксама павелічэннем вышыні пераносся. Жаночыя чарапы дрысвяцкай серыі выяўляюць выражаную тэндэнцыю да павелічэння практычна ўсіх абсалютных памераў у параўнанні з курганнымі жаночымі чарапамі [4, с. 18].

У перыяд функцыянавання грунтовага могільніка Дрысвяты-Пашавічы ў раёне возера Дрысвяты былі распаўсюджаны пахавальныя помнікі іншага тыпу, вядомыя як усходнелітоўскія курганы. З’яўленне культуры ўсходнелітоўскіх курганоў у гэтым рэгіёне звязана з міграцыяй насельніцтва з паўночнага захаду, з тэрыторыі сучаснай Літвы, у сярэдзіне I тыс. н.э. Далейшая эвалюцыя культуры была абумоўлена ўзаемадзеяннем прышлага насельніцтва з мясцовымі плямёнамі культуры штрыхаванай керамікі.

Краніялагічныя матэрыялы з ранніх усходнелітоўскіх курганаў былі даследаваны літоўскімі антраполагамі Г. Чэснісам і В. Урбанавічусам [8]. Раннія пахаванні ва ўсходнелітоўскіх курганах, як мужчынскія, так і жаночыя, прадстаўлены антрапалагічнім тыпам, які характарызуецца рэзка выражанай масіўнасцю, даліхакраніяй, вялікім падоўжаным і высотным дыяметрамі чэрапа, высокім, вельмі шырокім тварам з моцна выступаючым носам [1, с. 40–41]. У адрозненне ад гэтага гіпермасіўнага шыракатварага тыпу, мясцовае насельніцтва культуры штрыхаванай керамікі характарызавалася ўмеранай масіўнасцю і сярэднешырокім тварам [1, с. 39–40]. У эпоху сярэднявечча гэты ўмерана масіўны антрапалагічны тып быў шырока прадстаўлены на тэрыторыі Беларусі, у тым ліку ў курганных пахаваннях полацкіх крывічоў.

Выяўленае намі павелічэнне вышыні твару і вышыні чарапной каробкі ў мужчын дрысвяцкай серыі ў параўнанні з курганнымі чарапамі полацкіх крывічоў можа ўказваць на верагодны ўдзел носьбітаў культуры ўсходне-літоўскіх курганоў у фарміраванні антрапалагічных асаблівасцей насельніцтва Дрысвяцкай крэпасці.

І мужчынская, і жаночая выбаркі з грунтовага могільніка Дрысвяты-Пашавічы характарызуюцца павышанай унутрыгрупавой зменлівасцю, што ўказвае на генетычную неаднароднасць групы [4, с. 19]. Гэта цалкам заканамерна, калі ўлічыць, што для пасяленняў гарадскога тыпу, асабліва ў зоне актыўных этнічных кантактаў, змешаны этнічны склад насельніцтва ўяўляў сабой звычайную з’яву.

Характэрны зрух у бок масіўнасці ў жанчын грунтовага могільніка Дрысвяты-Пашавічы, а таксама больш выражаныя, чым у мужчын, антрапалагічныя адрозненні ад курганных крывіцкіх чарапоў таксама можна патлумачыць уплывам насельніцтва культуры ўсходнелітоўскіх курганоў. Па ўсёй верагоднасці, прышлае славянскае насельніцтва, пераважна мужчыны (прадстаўнікі княжацкай адміністрацыі, дружыннікі), маглі ўступаць у шлюб з мясцовымі балцкімі жанчынамі. Гэтая выснова адпавядае дадзеным

археалогіі. Да XI ст. умацаванае гарадзішча на востраве належала балцкаму насельніцтву; сярод упрыгожванняў, знойдзеных на гарадзішчы і селішчы, пераважалі рэчы балцкага культурнага кола (зааморфныя бранзалеты, трапецападобныя падвескі, фібулы з макападобнымі і ромбападобнымі галоўкамі) [6, с. 347].

***Грунтовы могільнік Казлоўцы (XI–XII стст.)*** размешчаны на правым беразе р. Дзісенкі, за 12 км на захад ад г. Дзісны. Археалагічныя раскопкі, праведзеныя ў 1988–1990 гг. Л.У. Дучыц і Г.М. Семянчуком, выявілі пахаванні па абраду крэмацыі і інгумацыі. Краніялагічныя матэрыялы з могільніка, якія трапілі ў нашае распараджэнне, нешматлікія і прадстаўлены 8 чарапамі, з якіх 4 мужчынскія і 4 жаночыя. Нягледзячы на сваю нешматлікасць, матэрыялы грунтовага могільніка Казлоўцы заслугоўваюць асаблівай увагі.

Сумарная мужчынская серыя грунтовага могільніка Казлоўцы характарызуецца памяншэннем практычна ўсіх абсалютных памераў мазгавой і тваравай частак чэрапа ў параўнанні з сумарнай серыяй полацкіх крывічоў, адносна шырокім і нізкім тварам, а таксама выражанай сплошчанасцю твару не толькі на ўзроўні арбіт, але і ў ніжняй яго частцы. Два мужчынскія чарапы маюць велічыні назамалярнага вугла, якія дасягаюць межаў мангалоіднасці (149,5є і 151є). Велічыні зігамаксілярнага вугла, хаця і перавышаюць 130є, не дасягаюць мангалоідных велічынь [3, с. 130].

Сумарная жаночая серыя грунтовага могільніка Казлоўцы, наадварот, вылучаецца некалькі больш выражанай масіўнасцю ў параўнанні з курганнымі жаночымі чарапамі, пры гэтым асноўныя прапорцыі мазгавой і тваравай частак чэрапа, а таксама вуглы прафіліроўкі твару адпавядаюць сярэднім велічыням, устаноўленым для курганных чарапоў.

Спалучэнне мезакраніі, невялікага падоўжанага дыяметра чэрапа, шырокага і нізкага твару з паслабленай прафіліроўкай, выяўленае ў мужчынскіх чарапоў з грунтовага могільніка Казлоўцы, можа быць звязана з фіна-вугорскім насельніцтвам. Падобны антрапалагічны тып, генетычна не звязаны з балцкімі плямёнамі, быў выяўлены на тэрыторыі Латгаліі сярод ранніх пахаванняў могільніка Ківты (VII–VIII стст.), у курганных пахаваннях Усходняй Латвіі (XI–XII стст.), а таксама ў курганнага насельніцтва Паўночнага Захаду Расіі, на тэрыторыі Наўгародскай зямлі [1; 5]. Магчымыя сувязі насельніцтва, што пакінула грунтовы могільнік Казлоўцы, з фінамоўным насельніцтвам знаходзіць сваё пацверджанне ў археалагічных матэрыялах [2].

Такім чынам, у XI–XII стст. на тэрыторыю Полацкай зямлі маглі пранікаць асобныя групы фіна-угорскага насельніцтва з поўначы, на што ўказваюць ярка выражаныя лапаноідныя рысы, выяўленыя ў 2-х мужчын з грунтовага могільніка Казлоўцы. Падабенства жаночых чарапоў з могільніка Казлоўцы да курганных жаночых чарапоў з тэрыторыі Полацкай зямлі можа ўказваць на шлюбныя сувязі прышлага фіна-угорскага насельніцтва, пераважна мужчын, з мясцовымі жанчынамі. Жаночыя пахаванні з грунтовага могіль-

ніка Казлоўцы змяшчаюць як балцкія рэчы (літыя бронзавыя бранзалеты з зааморфнымі галоўкамі, грушападобныя бронзавыя і білонавыя падвескі і інш.), так і крывіцкія бранзалетападобныя скроневыя кольцы з завязанымі канцамі [6, с. 128].

З мэтай удакладнення аб’ектыўнасці зробленых высноў намі быў праведзены кананічны дыскрымінантны аналіз, які дазваляе выявіць асноўныя заканамернасці міжвыбарачнай варыяцыі і прадставіць іх наглядна ў графічным выглядзе. Для правядзення кананічнага аналізу патрабуюцца індывідуальныя дадзеныя, таму намі былі выкарыстаны матэрыялы ўласных вымярэнняў па набору 14-ці найбольш інфарматыўных прыкмет у 4-х сінхронных краніялагічных серыях: 1) серыя грунтовага могільніка Дрысвяты-Пашавічы; 2) серыя грунтовага могільніка Казлоўцы; 3) серыя курганных чарапоў з тэрыторыі Полацкай зямлі; 4) матэрыялы грунтовага могільніка XI–XII стст. з Наваградка. Аналіз праводзіўся як у мужчынскіх, так і ў жаночых групах.

***Мужчыны.*** У выніку кананічнага аналізу былі вылучаны тры кананічныя пераменныя. Невыпадковасць адпаведнай заканамернасці міжгрупавой варыяцыі была даказана для першага кананічнага вектара (КВ I). Для другой і трэцяй кананічных пераменных такая невыпадковасць не была даказана, хаця верагоднасць памылкі 1-га роду для другога вектара не нашмат перавышае крытычны ўзровень. У табліцы 1 прадстаўлены каэфіцыенты карэляцыі паміж прыкметамі і кананічнымі вектарамі.

Табліца 1.

**Каэфіцыенты карэляцыі паміж прыкметамі і кананічнымі вектарамі ў групах мужчын**

| № паводле Марціна | Прыкмета | КВ I | КВ II |
|---|---|---|---|
| **77** | Назамалярны вугал | -0,75 | 0,04 |
| **54** | Шырыня носа | 0,34 | 0,04 |
| **SS:SC** | Сіматычны паказальнік | 0,38 | 0,17 |
| **48** | Верхняя вышыня твару | 0,16 | 0,46 |
| **55** | Вышыня носа | 0,15 | -0,18 |
| **<zm'** | Зігамаксілярны вугал | -0,29 | 0,11 |

Па выніках кананічнага аналізу быў пабудаваны графік ацэнак кананічных пераменных (мал. 1). На графіку прадстаўлена наглядная карціна ўзаемнага размяшчэння асобных чарапоў, якія належаць да розных груп.

Першая кананічная пераменная (КВ I) апісвае каля 63 % зменлівасці і вылучае антрапалагічны тып, які характарызуецца зніжэннем назамалярнага і зігамаксілярнага вуглоў, павелічэннем сіматычнага паказальніка, г. зн. дазваляе здзяйсняць падзел сукупнасці серый паводле ступені прафіліроўкі твару і выступання насавых костак. На графіку можна бачыць, што комплекс прыкмет, уласцівых вялікім велічыням першай кананічнай пераменнай, характэрны для серыі Дрысвяты-Пашавічы (моцная прафіліроўка твару, выражаны еўрапеоідныя рысы), і, наадварот, малыя значэнні першай кананічнай пераменнай праяўляюцца ў насельніцтва, што пакінула грунтовы могільнік Казлоўцы (паслабленая прафіліроўка, лапаноідныя рысы).




Малюнак 1. Узаемнае размяшчэнне мужчынскіх груп у прасторы 2-х кананічных пераменных

У цэлым дрысвяцкая серыя, а таксама серыі полацкіх крывічоў і Наваградка, выяўляюць значнае падабенства паміж сабой, на што ўказвае значнае ўзаемнае перакрыванне палёў графіка. Дрысвяцкая серыя вылучаецца некаторай спецыфічнасцю, аднак, разам з тым, для гэтых трох выбарак характэрна прыцягненне да адзінага цэнтра згушчэння.

Серыя мужчынскіх чарапоў з грунтовага могільніка Казлоўцы стаіць адасоблена, палі графікаў амаль не перакрываюцца. Кананічны аналіз, такім чынам, пацвердзіў антрапалагічную своеасаблівасць мужчынскіх чарапоў з грунтовага могільніка Казлоўцы.

***Жанчыны.*** Для жаночых груп таксама быў праведзены кананічны аналіз. У адрозненне ад мужчынскіх выбарак, невыпадковасць адпаведнай заканамернасці міжгрупавой варыяцыі была даказана для 2-х дыскрымінатараў.

Табліца 2.

**Каэфіцыенты карэляцыі паміж прыкметамі і кананічнымі вектарамі ў групах жанчын.**

| № паводле Марціна | Прыкмета | КВ I | КВ II |
|---|---|---|---|
| **9** | Найменшая шырыня лба | -0,51 | -0,29 |
| **<zm'** | Зігамаксілярны вугал | -0,54 | 0,03 |
| **51** | Шырыня арбіты (максілярная) | -0,34 | 0,36 |
| **48** | Верхняя вышыня твару | -0,34 | -0,28 |
| **DS:DC** | Дакрыяльны указальнік | 0,05 | 0,34 |
| **8** | Папярочны дыяметр | -0,10 | -0,39 |
| **17** | Высотны дыяметр | -0,01 | -0,37 |
| **1** | Падоўжаны дыяметр | -0,44 | 0,03 |

Па выніках кананічнага аналізу быў створаны графік ацэнак кананічных пераменных (мал. 2). Першы кананічны вектар апісвае каля 62 % зменлівасці і вылучае антрапалагічны тып, які характарызуецца памяншэннем зігамаксілярнага вугла, зніжэннем найменшай шырыні лба, падоўжанага дыяметра чэрапа і верхняй вышыні твару. Другі кананічны вектар апісвае каля 32 % зменлівасці і падзяляе выбаркі па велічыні папярочнага і высотнага дыяметраў чэрапа, а таксама шырыні арбіты і ступені выступання насавых костак.




Малюнак 2. Узаемнае размяшчэнне жаночых груп у прасторы 2-х кананічных пераменных

Паводле значэнняў 1-й і 2-й кананічных пераменных, серыя жаночых чарапоў з грунтовага могільніка Дрысвяты-Пашавічы даволі выразна вылучаецца вялікімі памерамі падоўжанага, папярочнага і высотнага дыяметраў чэрапа, высокім і шырокім тварам; зоны графікаў амаль не перакрываюцца. Больш выразна, у адрозненне ад мужчын, вылучаюцца і жаночыя чарапы з сярэднявечнага Наваградка.

У адрозненне ад дрысвяцкай серыі, серыя жаночых чарапоў з грунтовага могільніка Казлоўцы выяўляе значнае падабенства да серыі курганных чарапоў, пра што выразна сведчыць значнае перакрыванне палёў графіка.

Такім чынам, у выніку праведзенага аналізу можна зрабіць наступныя высновы. Узаемнае падабенства трох мужчынскіх груп (Дрысвяты, полацкія крывічы, Наваградак) можна патлумачыць тым, што ў фарміраванні антрапалагічных асаблівасцей насельніцтва апорных пунктаў славянскай калаізацыі, якімі былі Наваградак і Дрысвяты-Пашавічы, прымалі ўдзел выхадцы з Полацкай зямлі. У гэтым сэнсе звяртае на сябе ўвагу асаблівае падабенства серый Наваградка і крывічоў.

Больш выражаныя адрозненні ў жанчын могуць указваць на шлюбныя сувязі прышлых мужчын з жанчынамі – прадстаўніцамі карэннага насельніцтва. Большая кампактнасць паводле антрапалагічнага тыпу лакальных жаночых серый дазваляе прапанаваць гіпотэзу пра большую ўнутрыгрупавую генетычную аднастайнасць жанчын, атрыманую ў спадчыну ад папярэдніх пакаленняў.

Аналіз антрапалагічных матэрыялаў абодвух грунтовых могільнікаў з тэрыторыі Полацкай зямлі X–XIII стст. указвае на актыўныя міжэтнічныя кантакты, якія суправаджаліся разбурэннем прынцыпу племянной эндагаміі і спрыялі станаўленню новага тыпу этнічнай супольнасці, які прыходзіў на змену старой племянной арганізацыі разам са станаўленнем раннесярэднявечнай дзяржаўнасці.

## Літаратура

1. Денисова, Р.Я. География антропологических типов балтских племён и этногенетические процессы в I – начале II тысячелетия н.э. на территории Литвы и Латвии // Балты, славяне, прибалтийские финны: Этногенетические процессы. – Рига: Зинатне, 1990. – С. 28–81.

2. Дучыц, Л.У. Археалагічныя дадзеныя аб прыбалтыйскіх фінах на тэрыторыі Беларусі ў пачатку II тысячагоддзя // Гісторыя Беларусі: жалезны век і сярэднявечча. – Мінск, 1997. – С. 16–18.

3. Емяльянчык, В. Комплексная антрапалагічная характарыстыка насельніцтва Полацкай зямлі X–XIII стст. (па дадзеным краніялогіі) // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы IV Міжн. навук. канф. – Полацк, 2003. – С. 122–130.

4. Емельянчик, О.А. Краниологическая характеристика материалов грунтового могильника XI–XIII вв. Дрисвяты-Пашевичи // Вестник Полоцкого государственного университета. – Серия А. – 2006. – № 7. – С. 16–24.

5. Санкина, С.Л. Этническая история средневекового населения Новгородской земли по данным антропологии. – СПб, 1996. – 109 с.

6. Семянчук, Г.М. Новая катэгорыя археалагічных помнікаў на тэрыторыі Полацкай зямлі (грунтовыя могільнікі X–XIII стст.) // Гістарычна-археалагічны зборнік. – 1993. – Ч. 2. – С. 124–139.

7. Семянчук, Г. Дрысвяты – памежны горад Полацкай зямлі ў раннім сярэднявеччы (X–XIII стст.) // Труды VI Международного конгресса славянской археологии. Том 2. Славянский средневековый город. – М., 1997. – С. 343–353.

8. Чеснис, Г.А. Многомерный анализ антропологических данных как средство решения проблемы выделения балтских племенных союзов в эпоху железа (преимущественно на территории Литвы) // Балты, славяне, прибалтийские финны: Этногенетические процессы. – Рига: Зинатне, 1990. – С. 9–27.